УСЁ Ў ПАРАДКУ

ЛЕБЯДЗІНЫ ВОСТРАЎ, БЭЗАВЫ САД...

З'явіліся па ініцыятыве старшыні сельскага Савета ў аграгарадку Сіняўка

Паміж аграгарадком Сіняўка і вёскай Нарэшавічы ў Клецкім раёне ўжо сёлета з'явіцца Лебядзіны востраў. Месца адпачынку ўладкуюць у маляўнічых мясцінах на беразе возера, якое некалькі гадоў таму аблюбавалі прыгожыя і высакародныя птушкі.

— Тут будзе пляжная зона, масткі для лоўлі рыбы. Дзякуючы ініцыятыве мясцовых жыхароў у вадаём запусцілі малькоў, ачысцілі ад кустоў берагі. Плануюцца пляж, валейбольная пляцоўка, кантэйнеры для смецця, стаянка для машын, кабінкі для пераадзявання, альтанкі, мангалы, лаўкі, інфармацыйны стэнд. Усё абсталяванне ўжо гатова, — дзеліцца сваімі планамі **старшыня Сіняўскага сельскага Савета Ала СЯНЬКЕВІЧ.**

Ала Іосіфаўна нарадзілася ў Сіняўцы, тут вырасла, закончыла школу. Калі яе выбралі старшынёй сельскага Савета дэпутатаў, паабяцала землякам, што будзе імкнуцца зрабіць вёску райскім куточкам, надаць ёй каларыт і адметнасць. І да гэтага прыклала шмат намаганняў і фантазіі. За адносна кароткі прамежак часу ўдалося рэалізаваць тры праекты: «Крыніца», «Бэзавы сад» і «Амфітэатр».

Крыніца ў аграгарадку Сіняўка.

— Тры гады таму Клецкі райвыканкам аб'явіў конкурс праектаў па добраўпарадкаванні сельскіх населеных пунктаў. Гэты конкурс праходзіць і цяпер. І мы вельмі хацелі перамагчы. У выніку сталі пераможцамі, атрымалі 400 базавых велічынь на стварэнне аб'екта «Крыніца», — кажа Ала Іосіфаўна.

Калісьці гэтая тэрыторыя была закінутай. Яе расчысцілі, добраўпарадкавалі, крынічку «адзелі» ў драўляны зруб, зрабілі масткі, высадзілі кветкі. І сюды пацягнуліся не толькі мясцовыя жыхары, але і суседзі з Клецка, Мінска, Брэсцкай вобласці. Прыязджаюць адпачыць пад кронамі разгалістых дрэў і набраць крышталёва чыстай вады. Сярод мастачкоўцаў ходзіць легенда, што гэтая вада дапамагае вылечыць хваробу вачэй. Спецыялісты зрабілі даследаванні, якія пацвердзілі, што сапраўды па сваім хімічным складзе яна адмысловая. Над крыніцай усталявана дошчачка з вынікамі аналізаў. «Каб людзі бачылі, якую ваду п'юць», — удакладніла мая суразмоўніца.

— У мінулым годзе дзякуючы перамозе ў конкурсе мы зноў атрымалі грант райвыканкама і рэалізавалі яшчэ адзін праект — летні амфітэатр. Акрамя конкурсных, у нас ёсць і пазаконкурсныя праекты, — працягвае Ала Іосіфаўна.

У цэнтры каля Свята-Нікольскай царквы высаджаны бэзавы сад — візітная картка аграгарадка. Тэрыторыю, што непасрэдна прылягае да храма, калісьці акультурыў настаяцель на сродкі прыхаджан. А вось іншая яе частка была ў непрэзентабельным выглядзе. Раней тут знаходзіліся старыя паўразваленыя дамы. Іх прыбралі, а на ўчастках пасадзілі шмат кустоў бэзу розных відаў. Уладкавалі імправізаваны ручай з драўляным мастком, калодзеж з жураўлём, каменныя кашы для кветак, устанавілі лаўкі. Тут жа з'явілася і рабінавая алея. Па традыцыі тут штогод высаджваюцца маладыя дрэўцы — па колькасці дзяцей, што нарадзіліся за год на тэрыторыі сельсавета.

— Плануем адкрыць дзіцячую гульнявую пляцоўку насупраць школы ў скверы. Месца для яе ўжо падрыхтаванае, куплена неабходнае абсталяванне, — канстатуе старшыня. — У гэтым нам дапамаглі раённыя грамадскія арганізацыі «Беларускі саюз жанчын» і «Белая Русь». У планах стварэнне «Кірмашовага дворыка». Вядома, у нас ёсць месца для гандлю. Але хацелася б яго акультурыць, зрабіць сучасным і прыцягальным для вяскоўцаў, якія хочуць прадаць вырашчаную на прысядзібных участках прадукцыю.

І гэта яшчэ не ўсё. Справа ў тым, што ў аграгарадку налічваецца больш як 2000 жыхароў, а прыстасаванага месца для правядзення розных масавых мерапрыемстваў няма. Дом культуры будаваўся як кінатэатр, яго рэканструкцыя пад установу культуры дорага абыдзецца. Вялікія святы ладзяцца пераважна ўздоўж рэспубліканскай трасы, якая праходзіць праз вёску, што небяспечна. Таму і з'явілася ідэя ўладкаваць спецыяльнае месца, дзе можна сабраць людзей, арганізаваць канцэрт. А яшчэ ў марах старшыні пабудаваць на гэтай пляцоўцы крыты амфітэатр.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

За бярвёнамі можна і лесу недалічыцца...

Тры факты крадзяжу драўніны выявілі дзяржінспектары пры праверцы грузавога транспарту на тэрыторыі Мінскай вобласці — адзін у Вілейскім раёне, астатнія ў Пухавіцкім. Дзве апошнія справы характэрныя тым, што доўга разбірацца з імі інспектарам не прыйшлося — аднаго позірку было дастаткова, каб заўважыць неадпаведнасць грузаў суправаджальным дакументам, паведамілі ў Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і раслённага свету.

На аўтадарозе каля вёскі Чырвоны Араты Пухавіцкага раёна дзяржінспектары Асіповіцкай міжрайінспекцыі спынілі МАЗ, на якім кіроўца прыватнага прадпрыемства са Слуцка вёз лесапрадукцыю, адпушчаную Глускім лясгасам. Мяркуючы па накладной, у машыне павінны былі знаходзіцца 20 кубаметраў дубовых дроў коштам каля 400 рублёў. У дакладнасці гэтага дакумента правяраючыя ўсумніліся, як толькі зазірнулі ў кузаў прычэпа — там ляжалі моцныя дубовыя бярвёны буйных дыяметраў.

Каб устанавіць рэальны кошт грузу, дзяржінспектары прыцягнулі работнікаў Асіповіцкага лясгаса. Па іх падліках выйшла, што дроў у машыне было толькі 5,5 кубаметраў, астатняя драўніна — тэхсыравіна і піловачнік. Усю лесапрадукцыю ацанілі амаль у тры тысячы рублёў. Аўтамабіль і груз арыштаваныя, Пухавіцкі РАУС праводзіць праверку, пасля якой можа быць распачата крымінальная справа.

Яшчэ па адным факце крадзяжу драўніны, выяўленым дзяржінспектарамі Мінскай міжрайінспекцыі, Пухавіцкі РАСК ужо пачаў крымінальны працэс. На трасе Мінск — Гомель каля вёскі Пухавічы ў пачатку мая супрацоўнікі інспекцыі спынілі трактар з прычэпам, на якім перавозілі сасновыя бярвёны — 35 штук аб'ёмам 11,5 кубаметра. У прад'яўленай кіроўцам накладной значылася, што драўніна была адгружана месяц таму — у сапраўднасці ж спілоўкі на бярвёнах былі зусім свежыя.

У ходзе разбору высветлілася, што драўніну выкралі ў індывідуальнага прадпрымальніка, які заключыў дагавор з лясгасам на расчыстку трасы ўздоўж ЛЭП. Аплату за свае паслугі ён пагадзіўся ўзяць лесапрадукцыяй. Для выканання работ ІП наняў брыгаду вальшчыкаў. Адзін з іх і падазраецца ў крадзяжы і незаконным збыце лесу.

Недакладнасці ў афармленні дакументаў на драўніну выклікалі падазрэнні і ў інспектараў Мядзельскай міжрайінспекцыі пры праверцы аўтамабіля-лесавоза Scania, які выязджаў з тэрыторыі Ільянскага лясніцтва Вілейскага доследнага лясгаса. Адпраўніком і атрымальнікам грузу (38 кубаметраў елкі), згодна з дакументам, быў адзін і той жа індывідуальны прадпрымальнік. Мужчыну выклікалі на месца затрымання аўтамабіля — пры дэталёвым апытанні ён прызнаўся ў крадзяжы. Вырашаецца пытанне аб крымінальнай адказнасці.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.
Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 20 чэрвеня 2017 года.